**Дзяржаўны дэпартамент ЗША**

**Справаздача аб гандлі людзьмі**

**2009 год**

**Беларусь (другая група)**

Беларусь ёсць краінай-крыніцай і краінай транзіту жанчын, мужчын і дзяцей, якіх перапраўляюць з Беларусі ды суседніх краін у Расію, Германію, Польшчу, Чэшскую Рэспубліку, Літву, Латвію, Аўстрыю, Нідэрланды, Ізраіль, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты (ААЭ), Турцыю, Егіпет, Украіну ды Рэспубліку Тога з мэтай камерцыйнай сэксуальнай эксплуатацыі і для прымусовай працы. Улады вызначылі 591 ахвяру гандлю людзьмі, з якіх 458 (у тым ліку 96 непаўналетніх) вывезлі з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі, і 133 – для прымусовай працы. Жанчын-ахвяраў было 366 (у тым ліку 42 непаўналетніх), мужчын – 225 (у тым ліку 61 непаўналетні). Улады вызначылі 246 ахвяраў, перапраўленых з мэтай эксплуатацыі ў межах Беларусі. Даследванне сітуацыі з гандлем мужчынамі, праведзенае МАМ у 2008 годзе, паказала, што больш як 60 адсоткаў мужчын, што сталі ахвярамі гандлю паміж 2004 і 2006 гг. і звярнуліся па дапамогу, мелі нейкую прафесійную падрыхтоўку ці вышэйшую адукацыю. Праводзілася расследаванне адной справы ў дачыненні да жыхароў Беларусі па абвінавачаннях у продажы бяздомных грамадзян Расеі ў рабства ў Беларусь.

Дзейнасць урада Беларусі не поўнасцю адпавядае мінімальным стандартам па выкараненні гандлю людзьмі, аднак урад прыкладае значныя намаганні для дасягнення гэтай мэты. Беларускі ўрад паслядоўна рабіў захады для пераследу і пакарання вінаватых у гандлі людзьмі, аднак падтрымка праграмаў дапамогі ахвярам па-ранейшаму была недастатковай, а бальшыня выяўленых ахвяраў гандлю не былі скіраваныя ўладамі да арганізацый, што прапануюць адпаведную дапамогу.

**Рэкамендацыі для Беларусі:** павялічыць аб'ём рэсурсаў, скіраваных на прадастаўленне дапамогі ахвярам і іх абарону ў межах Беларусі, забяспечыць адпаведную дапамогу і абарону ахвярам-мужчынам і дзяцям, працягваць аптымізацыю адміністратыўных працэдур, звязаных з абаронай ахвяраў, заахвочваць шырокае асвятленне расследаванняў у адносінах да супрацоўнікаў праваахоўных органаў па абвінавачаннях у саўдзеле ў гандлі людзьмі, працягваць паляпшэнне адносінаў з партнёрскімі НДА, што змагаюцца супраць гандлю людзьмі, і ствараць умовы для падтрымкі іх дзейнасці, рабіць захады для памяншэння попыту на платныя сэксуальныя паслугі і прымусовую працу.

**Судовы пераслед**

У 2008 годзе ўрад працягваў прымаць значны аб'ём праваахоўных мер. Беларускі закон забараняе перапраўку людзей і з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі, і для прымусовай працы і прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрміны ад 5 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці ў адпаведнасці з Артыкулам 181 Крымінальнага кодэкса. Такое пакаранне дастаткова жорсткае, параўнальнае з тымі, што прадугледжаныя за іншыя цяжкія злачынствы. У 2008 годзе беларускія ўлады праводзілі расследаванне 333 спраў, звязаных з гандлем людзьмі. У 69 выпадках абвінавачанні былі прад'яўленыя ў адпаведнасці з Артыкулам 181, а яшчэ 160 супрацьпраўных дзеянняў, звязаных з гандлем людзьмі, падлягалі крымінальнаму пераследу ў адпаведнасці з іншымі артыкуламі, напрыклад, па абвінавачаннях у суценёрстве, выкраданні ці ўцягванні непаўналетніх у антысацыяльныя паводзіны. Паводле афіцыйных звестак, у 2008 годзе ў адпаведнасці з Артыкулам 181 было вынесена 17 абвінаваўчых прысудаў, а па іншых абвінавачаннях у здзяйсненні супрацьпраўных дзеянняў, звязаных з гандлем людзьмі, яшчэ 112 прысудаў. Большасць прызнаных вінаватымі ў гандлі людзьмі былі асуджаныя на пазбаўленне волі на больш як восем гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Не паступала паведамленняў ні пра расследаванні, ні пра судовы пераслед, ні пра вынясенне абвінаваўчых прысудаў у дачыненні да службовых асобаў за саўдзел у гандлі людзьмі. Не паступала паведамленняў пра саўдзел уладаў у супрацьпраўных дзеяннях, звязаных з гандлем людзьмі, аднак атрыманне такой інфармацыі магло быць абмежаванае з-за адсутнасці свабоды СМІ і зняволенне, прадугледжанае ў Беларусі за крытыку на адрас урадавых службоўцаў. Падчас перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, у рамках дзейнасці дзяржаўнага цэнтра па супрацьдзеянні гандлю людзьмі пры Міністэрстве ўнутраных спраў урад працягваў працу па падрыхтоўцы для праваахоўных органаў, судоў і Генеральнай пракуратуры спецыялістаў па вызначэнні і абароне ахвяраў гандлю. Частыя перастаноўкі кадраў у праваахоўных органах, недастатковая ступень каардынацыі паміж установамі і іншыя бюракратычныя перашкоды зніжалі агульную эфектыўнасць высілкаў праваахоўнай сістэмы, скіраваных супраць гандлю людзьмі.

**Абарона**

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, захады ўладаў, скіраваныя на абарону ахвяраў і прадастаўленне ім дапамогі, ацэньваюцца неазназначна. Урад папранейшаму не быў здольны забяспечыць фінансаванне спецыялізаваных праграм дапамогі ахвярам, зацверджанае прэзідэнцкім указам ад 2005 года. Паводле ўладаў, у 2008 годзе толькі 125 з 591 ахвяры былі скіраваныя (паводле ўседзяржаўнага механізма накіравання) да арганізацый, што прапануюць дапамогу ахвярам. Звычайна для атрымання каротка- і доўгатэрміновай дапамогі і рэабілітацыі супрацоўнікі праваахоўных органаў скіроўваюць ахвяраў гандлю людзьмі да МАМ ці прытулкаў, арганізаваных НДА, што залежаць ад фінансавай падтрымкі

донарскіх арганізацый. Улады забяспечвалі працу 156 дзяржаўных сацыяльных цэнтраў, якія тэарэтычна здольныя прадастаўляць паслугі ахвярам гандлю па вяртанні на радзіму, але толькі 17 прапануюць спецыялізаваныя паслугі, скіраваныя на ахвяраў гандлю. Службовыя асобы скіроўваюць непаўналетніх ахвяраў да аднаго з 146 дзяржаўных сацыяльных і адукацыйных цэнтраў сістэмы Міністэрства адукацыі. У адпаведнасці з беларускай сістэмай аховы здароўя, ахвяры маюць права звяртацца па бясплатную медыцынскую дапамогу, але бальшыня ахвяраў не звяртаюцца па медыцынскую дапамогу ў дзяржаўныя медыцынскія ўстановы, таму што не жадаюць прадастаўляць інфармацыю супрацоўнікам клінік ці з-за нізкай якасці паслуг, што ім прапануюць. Усё яшчэ сустракаюцца выпадкі, калі ўлады прымушаюць ахвяраў супрацоўнічаць са следствам, але праваахоўныя ўстановы на просьбу ахвяраў дазвалялі спецыялістам НДА прысутнічаць на апытаннях у міліцыі і на закрытых судовых паседжаннях. Беларускі закон дазваляе ўладам прадастаўляць ахвярам-грамадзянам іншых краін права на часовае знаходжанне на тэрыторыі краіны. Паводле прэзідэнцкага ўказа ад 2005 года, ахвяры гандлю не падлягаюць дэпартацыі і пераследу за супрацьзаконныя дзеянні, што сталі непасрэдным вынікам іх перапраўкі. З 2002 па 2008 гг. беларускія суды вынеслі рашэнні аб выплаце ахвярам гандлю кампенсацый на агульную суму 79 000 долараў. НДА ў Беларусі часта працуюць ва ўмовах запалохвання і шчыльнага кантролю з боку ўладаў, але бальшыня НДА, чыя дзейнасць скіраваная супраць гандлю людзьмі, паведамлялі пра тое што на працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, улады скарацілі некаторыя затрымкі, выкліканыя бюракратызмам і груваскімі працэдурамі рэгістрацыі праектаў.




(*) Група краін, што патрабуюць асаблівай увагі

**Прадухіленне**

У 2008 годзе беларускі ўрад працягваў прыкладаць намаганні, скіраваныя на азнаямленне грамадзян з праблемай гандлю людзьмі і яго прадухіленне. Урад па-ранейшаму фінансаваў дзейнасць дзяржаўнай акадэміі па падрыхтоўцы кадраў у сферы супрацьдзеяння гандлю людзьмі. Таксама ўрад прафінансаваў стварэнне і размяшчэнне на дзяржаўных тэлеканалах серыі сацыяльных ролікаў, скіраваных супраць гандлю людзьмі. Службовыя асобы па-ранейшаму праводзілі прэс-

канферэнцыі ды брыфінгі па сітуацыі ў сферы супрацьдзеяння гандлю людзьмі ў Беларусі. Міністэрства адукацыі распаўсюджвала дапаможнік для настаўнікаў па правядзенні заняткаў, скіраваных на прадухіленне гандлю. Міністэрства ўнутраных спраў па-ранейшаму забяспечвала працу гарачай лініі па пытаннях аб законным статусе і сапраўднасці ліцэнзій агенцыяў, што займаюцца працаўладкаваннем і ўладкаваннем на навучанне за мяжой, але па іншых пытаннях грамадзян скіроўвалі да гарачых ліній, што падтрымліваюцца і фінансуюцца НДА. Паводле сведчанняў НДА, улады актыўна ўдзельнічалі ў справе размеркавання азнаямляльных матэрыялаў, выданне якіх фінансавалі НДА. Паступалі паведамленні пра тое, што некаторыя захады ўладаў, прадстаўленыя як меры супрацьдзеяння гандлю людзьмі, напрыклад, кантроль над паездкамі за мяжу студэнтаў і прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп, накладаюць неналежныя абмежаванні на магчымасці грамадзян Беларусі ездзіць за мяжу з законнымі мэтамі.